Ліна Багданава

# Як маленькія сябры найвялікшы скарб шукалі



Мінск
«Беларусь»
2020

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)-44
Б14

Мастак *Вераніка Ткачова*

*Для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту*

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе*
*Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь*

**Багданава, Л.**

Б14 Як маленькія сябры найвялікшы скарб шукалі / Ліна Багданава ; маст. Вераніка Ткачова. — Мінск : Беларусь, 2020. — 87 с. : іл.

ISBN 978-985-01-1379-5.

Жыхары невялікага беларускага гарадка Яначка і Данька збіраюцца ў першы клас. Добрая малеча вырашае падараваць сваёй школе што-небудзь вельмі прыемнае, важнае і каштоўнае. Але дзе знайсці такі падарунак, які б усім у школе быў карысны? Дый не толькі ў школе… На дапамогу дзецям прыходзіць казка. Берагіня найлепшых традыцый свайго краю Скарынка знаходзіць дзятве незвычайных памочнікаў — беларускіх гномаў. Тыя разбрыдаюцца па краіне, каб адшукаць найвялікшы скарб.

Хочаш дапамагчы ім і разгадаць сакрэт гіганцкага брыльянта? Кіруй за героямі кнігі. Разам вы абавязкова дасце рады! Зычу захапляльных прыгод!

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-01-1379-5**

© Багданава Л., 2020
© Ткачова В., ілюстрацыі, 2020
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2020

## Ад аўтара

Вітаю, шаноўны чытач! Цешуся, што знайшоў час разгарнуць гэтую кнігу. Спадзяюся, ты прабавіш яго цікава і карысна.

Ці ведаеш ты, што ў Беларусі жывуць гномы? І нават не толькі жывуць, але і актыўнічаюць! Праўда, яны даўно зрадніліся з тутэйшымі міфічнымі істотамі і аддаюць перавагу перад таямнічымі падзямеллямі нашым цудоўным лясам і азёрам, традыцыйныя гномавы каптанікі змянілі на льняныя строі і саламяныя капелюшы, а замест аховы закапаных у зямлі скарбаў займаюцца куды больш цікавымі справамі.

Але цуды чыніць не развучыліся! І людзям дапамагаць у іх цудоўна атрымліваецца.

Скажаш: усё гэта пустыя выдумкі і бабуліны казкі? Не факт!

Не верыш? Упэўніся сам! Прачытваючы старонку за старонкай гэтай незвычайнай кнігі, ты не толькі паверыш у існаванне гэтых пацешных і добрых істот, але і даведаешся багата новага. Пазнаёмішся з вясёлымі дашкалятамі Яначкай і Данькам, іх ціхім утульным гарадком. І галоўнае: зможаш прыняць удзел у адной важнай і сакрэтнай справе. Калі захочаш, зразумела.

Такім чынам, ты гатовы да прыгод? Тады перагарні старонку…

І не хвалюйся, я буду побач.

# 4

# Янaчка і Данька загадваюць жаданне

— ...Так нашы адважныя вандроўнікі сталі ўладальнікамі найвялікшага скарбу Пустэльнага свету. Выкарысталі яго на карысць людзям. Таму жыў іх народ доўга і шчасліва, — скончыла мама і загарнула кнігу. Патушыла святло ў дзіцячым пакоі. Нахілілася над блізнятамі. Пацалавала адразу Яначку, потым Даньку:

— Дабранач, мае даражэнькія. Добрых вам сноў.

— Дзякуй... Дабранач, ма... — бязладным хорам адказалі дзеці.

— І каб без фокусаў! — папярэдзіла мама, зачыняючы дзверы.

Хвіліну ў пакоі панавала цішыня. Першым не вытрымаў Данька:

— Яна, спіш?

— Заснеш тут, як жа, — заварушылася сястрычка. — Прыгоды. Перажыванні. Скарбы...

— Сапраўды! Я таксама зацікавіўся. Нават ідэя з’явілася. А што, калі б мы...

— Цыц! Мама ідзе!

Маленькія змоўшчыкі сцішыліся. Крокі ў калідоры — таксама.

— Фффу, пранесла. Ну, ніякага асабістага жыцця!

— Спі ўжо, летуценнік! — хіхікнула Яначка. — А то малако прымусяць піць паранае. І чаму мама лічыць малако найлепшым снатворным? Асабіста я яго не зношу.

— Ну што ты заладзіла: малако ды малако? Кажу ж сур’ёзна: ідэя ў мяне.

## 5

— Заўтра пра сваю ідэю распавядзеш. На свежую галаву.

— Лёгка сказаць: заўтра. У мяне ажно кіпіць усё ўнутры! Паспрабуй цяпер засні.

Данька ўздыхнуў, павярнуўся на бок. Утаропіўся ў акно. Велізарны месяц вісеў над садам. У пасярэбраным месячным святлом небе плылі дзівосна прыгожыя аблокі. Скрозь іх загадкава праблісквалі зоркі. Абрысы старых яблынь і груш на гэтым тле цямнелі мільёнамі неразгаданых таямніц. Іх няроўныя цені гайдаліся па сценах пакоя. Нібыта танцавалі пад акампанемент пасопвання дзяцей, якія салодка спалі.

### Ад аўтара

Яначка і Данька, шасцігодкі-блізняткі, жывуць у невялікім утульным гарадку Бялынічы. Ім страшэнна падабаецца гуляць, фантазіраваць, слухаць казкі і абмяркоўваць іх. А яшчэ яны любяць свой горад, яго цэнтр, ускраіны і маляўнічую раку, што цячэ непадалёк.





## Ад аўтара

Вось такая атрымалася ў Яначкі і Дані прыгода. Ці то казка, ці то не, мяркуйце самі. Бо сёння самыя смелыя казкі сталі звыклай рэальнасцю. Ніхто не здзіўляецца «дыванам-самалётам» у аэрапортах, «абрусу-самабору» ў кафэ і рэстаранах, «чароўным люстэркам» і «сподкам», пераўтвораным у тэлевізары, ноўтбукі, планшэты і тэлефоны. Шмат, вельмі шмат можа Чалавек, які шануе Любоў, Мудрасць і Працу. На любыя подзвігі ён здольны. Любыя скарбы даступныя яму. Вось і нашы маленькія непаседы атрымалі крыху ад Галоўнага Скарба: восем выдатных сяброў і сотні ідэй каштоўных падарункаў. А яшчэ веру ў чалавечае сяброўства і мудрасць. І жаданне развіваць тое, чым багатая наша Беларусь. Друкарскі двор Уладзіміра Ліхадзедава адправіўся ў падарожжа ў часе і прасторы. А беларускія гномы знайшлі сабе новы занятак па душы.

Аўтар, героі і чытачы дзякуюць паважаным у краіне і за мяжой арганізацыям і прадпрыемствам, згаданым у гэтай кнізе, за той уклад, які яны ўносяць у захаванне нашай прыроднай, гістарычнай, культурнай і духоўнай спадчыны.

Літаратурна-мастацкае выданне

**Багданава** Ліна

# Як маленькія сябры найвялікшы скарб шукалі

Рэдактар *А. А. Галкоўская*
Мастацкія рэдактары *Н. Р. Агародная, В. Г. Загародні*
Тэхнічны рэдактар *С. Л. Печанёва*
Карэктар *Н. Г. Баранава*

Падпісана да друку 19.08.2020. Фармат $84\times108^{1}/_{16}$.
6+
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 9,24. Ул.-выд. арк. 5,0.
Тыраж 700 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня «Перамога».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.